ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 30 (630) | Субота, 15 лістапада 1986 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ТЫДЗЕНЬ АКТЫЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**У наступны панядзелак, 17-га лістапада ва ўсім свеце будзе адзначацца Міжнародны дзень студэнтаў. Сёлета — у год міру ён набывае асаблівае значэнне: выльецца ў агляд сумеснай барацьбы за спыненне гонкі ўзбраенняў, прадухіленне тэрмаядзернай вайны, умацаванне дружалюбных сувязей студэнцкай моладзі ўсіх краін. На бягучым тыдні шмат мерапрыемстваў, прымеркаваных да гэтай даты, праводзіцца і ў нашым універсітэце Клубам інтэрнацыянальнай дружбы «Саюз», іншымі грамадскімі арганізацыямі. У праграму ўвайшлі конкурсы палітычнага плаката, сустрэчы з замежнымі студэнтамі, якія вучацца ў ГДУ, і інш.**

**(Наш кар.)**

## ПРЫЗЁРЫ ЎСЕСАЮЗНАЙ АЛІМПІЯДЫ

У АДНЫМ з прыгажэйшых гарадоў Украіны — Харкаве прайшоў III тур Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» па эканоміцы, арганізацыі і планаванню прамысловай вытворчасці. У Харкаўскім інжынерна-эканамічным інстытуце сабралася 70 прадстаўнікоў з усіх саюзных рэспублік, МДУ імя М. В. Ламаносава і Ленінграда.

Беларусь на алімпіядзе прадстаўлялі Галіна Сыч з Беларускага інстытута народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышава, Ірына Лапуціна з БПІ і студэнтка гр. Т-51 эканамічнага факультэта нашага універсітэта Святлана Кавалёва.

Канференцыя праходзіла даволі цікава. Перад яе ўдзельнікамі са змястоўнымі дакладамімі выступілі вядучыя вучоныя — эканамісты братняй Украіны.

У захапляючай абстаноўцы ішла барацьба за камандную перамогу на алімпіядзе. Усіх здзівілі сваімі трывалымі ведамі студэнты Узбекскай ССР. Яны набралі найбольшую колькасць балаў. Другое месца дасталося беларускім дзяўчатам. Трэцімі прызёрамі алімпіяды сталі студэнты Украіны.

Усе прызёры алімпіяды ўзнагароджаны граматамі.

Адначасова з камандамі-пераможцамі вызначаліся лепшыя студэнты ў індывідуальным заліку. Сярод беларускіх дзяўчат лепшых вынікаў дасягнула С. Кавалёва. Яна заняла дзявятае месца.

## ПРАФСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ СТУДЭНТАЎ

30-га кастрычніка адбылася X справаздачна-выбарная студэнцкая прафсаюзная канференцыя.

Са справаздачай прафсаюзнага камітэта студэнтаў за папярэднія два гады выступіла яго старшыня **Н. І. Колтышава.**

Справаздачу рэвізійнай камісіі зрабіў яе старшыня **Э. Строгін.**

У абмеркаванні заслуханых справаздач прынялі ўдзел студэнт 5-га курса геалагічнага факультэта член прафкома **В. Дзядкоў,** студэнтка 4-га курса гістфіла, член студсавета інтэрната № 1 **А. Лапаценка,** прафорг гр. Г-51 гістфіла **Н. Рудзякова,** прарэктар па вучэбнай рабоце універсітэта **Л. А. Шамяткоў,** студэнтка 4-га курса, старшыня прафбюро матэматычнага факультэта **А. Лебедзева,** першакурсніца эканамічнага факультэта **І. Бейзерава,** студэнтка 4-га курса матфака, член прафкома **А. Гаўрылавец,** студэнтка 4-га курса гістфіла **С. Гайдамака,** сакратар камітэта камсамола ГДУ **А. Дземідзенка,** студэнтка 4-га курса матфака, член студсавета інтэрната № 2 **Г. Рэшацько,** студэнт 4-га курса геафака **А. Пачыцкі,** прарэктар па АГР **У. А. Шаўчэнка.**

У прынятай на канферэнцыі пастанове работа прафкома за справаздачны перыяд прызнана здавальняючай. Прадугледжаны меры па далейшаму яе паляпшэнню і ўдасканаленню.

На канферэнцыі зацверджана справаздача рэвізійнай камісіі.

Выбраны новыя саставы прафкома студэнтаў, рэвізійнай камісіі, дэлегаты на абласную справаздачна-выбарную прафсаюзную канферэнцыю.

Справаздача аб X прафсаюзнай канферэнцыі студэнтаў будзе змешчана ў наступным нумары нашай газеты.

## ГОСЦЬ — НАРОДНАЯ НАСТАЎНІЦА СССР

Сярод тых, хто больш 30 гадоў таму назад закончыў філалагічны факультэт былога Гомельскага пединстытута імя В. П. Чкалава, — Вольга Сысоеўна Аўраменка. Увесь гэты час яна нястомна працуе на педагагічнай ніве, **на працягу многіх** гадоў выкладае рускую мову і літаратуру ва Уваравіцкай сярэдняй школе Буда-Кашалёўскага раёна.

У вопытнага, улюблёнага ў сваю высакародную справу педагога — многія сотні выхаванцаў, якія ўспамінаюць Вольгу Сысоеўну з вялікай удзячнасцю. Яе імя стала шырока вядома не толькі ў нашай рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. В. С. Аўраменка першай у Беларусі прысвоена ганаровае званне народнай настаўніцы СССР. Яна была дэлегатам гістарычнага XXVII з'езда КПСС, з'яўляецца дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, мае высокія ўрадавыя ўзнагароды.

Днямі В. С. Аўраменка наведала сваю родную навучальную ўстанову, дзе атрымала вышэйшую адукацыю і пуцёўку ў самастойнае працоўнае жыццё. Тут яна сустрэлася са студэнтамі, выкладчыкамі і супрацоўнікамі гісторыка-філалагічнага факультэта. Вольга Сысоеўна падзялілася ўражаннямі, якія засталіся ў яе ад XXVII з'езда КПСС, расказала пра сваю дэпутацкую і грамадскую дзейнасць. Вельмі карысным было для студэнтаў пачуць ад яе і аб вопыце шматгадовай педагагічнай працы ў сельскай мясцовасці.

Ва ўдзячнасць за цікавую сустрэчу студэнты ўручылі Вользе Сысоеўне Аўраменка кветкі.

## ПРА МІНУЛАЕ І СЁННЯШНЯЕ ГОМЕЛЯ

На гэтым тыдні ва універсітэце пачаліся цыклавыя чытанні. У панядзелак са студэнтамі эканамічнага факультэта сустрэўся супрацоўнік Гомельскага абласнога музея У. А. Літвінаў. Ён выступіў з лекцыяй аб архіўных помніках Гомеля.

Такія ж лекцыі праслухалі будучыя біёлагі і геолагі. Акрамя названага лектара перад студэнтамі выступіў супрацоўнік абласнога музея, выпускнік гістарычнага аддзялення нашага універсітэта А. А. Макушнікаў.

## НА ПРАГЛЯДЗЕ — НОВАЯ ЛІТАРАТУРА

Бібліятэка нашага універсітэта — адна з буйнейшых у вобласці. Штогод яе фонды папаўняюцца дзесяткамі тысяч экземпляраў новых выданняў. Шмат разнастайнай літаратуры паступіла ў скарбніцу выдаў за апошні час. Па традыцыі бібліятэкай арганізаваны прагляд набытых кніг. Яны выстаўлены ў фае галоўнага корпуса ГДУ каля чытальнай залы.

**(Наш кар.).**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра рускай літаратуры горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры СІМАНАВУ Тамару Рыгораўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.**

*БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ВОСЕНЬ*

## МАЙСТРЫ МАСТАЦТВАЎ — ГАМЯЛЬЧАНАМ

Штогод і традыцыйна 20—30 лістапада становяцца знамянальнай падзеяй для аматараў музыкі. Гэта — Усесаюзны фестываль мастацтваў «Беларуская музычная восень». Сёлета ён праводзіцца ў трынаццаты раз. Цікавай і шырокай абяцае быць праграма фестывальных дзён у Гомелі.

У наступныя чацвер і пятніцу на сцэнах музычнага і педагагічнага вучылішчаў выступіць народная артыстка СССР, салістка Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Літоўскай ССР Н. Амбразайцітэ. У рэпертуары спявачкі шмат вакальна-сімфанічных твораў буйнай формы. Багаты яе камерны рэпертуар, у якім старадаўняя класічная і сучасная музыка.

24—25 лістапада ў залах цэнтральнай дзіцячай школы № 1 і аб'яднання «Беларусьнафта» выступіць народная артыстка СССР К. Сартбаева. Яна выконвае партыі Дэздэмоны, Чыо-Чыо-Сан, Тацціяны, Маргарыты, Ай-Чурэк, Джамілі і інш.

Парадуе слухачоў сваім мастацтвам лаўрэат міжнародных конкурсаў Дзяржаўны квартэт імя Д. Шастаковіча, у складзе якога дзве скрыпкі, альт, віяланчэль. У праграме квартэта, канцэрт якога адбудзецца 22 лістапада ў музвучылішчы імя Н. Ф. Сакалоўскага, — творы заходнееўрапейскіх і рускіх класікаў, а таксама лепшых сучасных аўтараў. Асабліва блізкая і зразумелая ўдзельнікам гэтага ансамбля квартэтная творчасць Д. Шастаковіча.

Адной з цікавейшых сустрэч «Беларускай музычнай восені» стане выступленне Дзяржаўнай Рэспубліканскай акадэмічнай рускай харавой капэлы імя А. Юрлова, якая займае вядучае месца сярод харавых калектываў краіны. Яна ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Сярод выконваемых твораў — араторыі, кантаты, месы, рэквіемы, харавыя цыклы, песні. Аснову рэпертуара складае савецкая музыка С. Пракоф'ева, Д. Шастаковіча, Г. Свірыдава, В. Шабаліна і іншых савецкіх кампазітараў. Сустрэча з калектывам адбудзецца 27—29 лістапада на сцэнах музычнага і педагагічнага вучылішчаў, а таксама ГДУ.

Навучэнцаў гомельскіх прафтэхвучылішчаў чакае цікавая сустрэча з саксафаністкай М. Шапашнікавай.

Харэаграфічныя калектывы фестывалю мастацтваў прадстаўлены Дзяржаўным ансамблем танца БССР і вакальна-харэаграфічным ансамблем «Лазгі» з Узбекістана.

У канцэрце дыпламанта Усерасійскага конкурсу артыстаў эстрады і кіно Аляксандра Міхайлава (Ленінград) прагучаць творы А. Блока, А. Ахматавай, С. Ясеніна, Б. Пастэрнака, А. Вазнясенскага, вершы і песні Р. Бернса, Б. Акуджавы. Сустрэчы з ім адбудуцца 28—30 лістапада ў Палацы культуры будаўнікоў.

Разнастайная і змястоўная праграма артыста Вінніцкай абласной філармоніі, дыпламанта рэспубліканскага конкурсу Б. Астрамагільнага. Яна складаецца з дзвюх частак, уключае творы мастацкай і публіцыстычнай Ленініяны, а таксама творы савецкіх паэтаў-класікаў і сучасных аўтараў.

Для шматлікіх аматараў савецкай эстрады прадугледжаны канцэрты папулярных калектываў і выканаўцаў. На сцэне Дома палітасветы 28—30 лістапада выступіць заслужаная артыстка Малдаўскай ССР Надзежда Чапрага ў суправаджэнні групы «Плай».

Адкрыццё XIII Усесаюзнага фестывалю мастацтваў «Беларуская музычная восень» адбудзецца 20 лістапада ў Палацы культуры і тэхнікі чыгуначнікаў імя У. І. Леніна. Пачатак — у 19.30.

**Н. КОЛТЫШАВА,**
старшыня прафкома студэнтаў.

*ХХ З'ЕЗДУ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!*

# ЧАС ПАТРАБУЕ ІНІЦЫЯТЫВЫ І ТВОРЧАСЦІ

*Нататкі з X агульнауніверсітэцкай справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі*

**Сёлетнія справаздачы і выбары ў камсамольскіх арганізацыях краіны — асаблівыя. Яны праходзяць пасля XXVII з'езда КПСС, і юнакі і дзяўчаты падводзяць вынікі сваёй работы па рэалізацыі яго рашэнняў, паскарэнню сацыяльна-эканамічнага развіцця, перабудове ў мысленні, псіхалогіі моладзі. Рыхтуецца камсамолія і да свайго чарговага форуму — XX з'езда ВЛКСМ. Сустрэць яго дастойна — справа гонару кожнага камсамольца. Напярэдадні яго кожны павінен спытаць сябе: ці ідзе ў нагу з часам камсамольская арганізацыя, членам якой я з'яўляюся, ці развіваецца ініцыятыва, павышаецца баявітасць камсамола ў барацьбе за паскарэнне і перабудову?**

Камсамольская арганізацыя нашага універсітэта налічвае ў сваіх радах 3420 членаў ВЛКСМ. Калі разглядаць гэту лічбу ў маштабах краіны, сказаў у справаздачным дакладзе камітэта ЛКСМБ ГДУ яго сакратар **А. Дземідзенка**, яна не такая ўжо вялікая. Але і мы сёння можам сказаць нямала аб тых поспехах, якіх дасягнулі, аб тым пасільным укладзе, які ўнеслі ў агульную справу. У той жа час мы не закрываем вочы на тыя промахі і пралікі, якія яшчэ мелі месца, крытычна ацэньваем дасягнутае, ставім перад сабой новыя мэты і будзем змагацца за іх ажыццяўленне.

## ВУЧОБА — ГАЛОЎНЫ АБАВЯЗАК

Асноўным крытэрыем ацэнкі работы кожнай камсамольскай арганізацыі ВНУ з'яўляецца барацьба за глыбокія веды студэнтаў. У справаздачным дакладзе камітэта камсамола, выступленнях у спрэчках дэлегатаў справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі шмат гаварылася аб паспяховасці студэнтаў ГДУ. Гучала заклапочанасць аб яе нізкім агульным узроўні. Гэта, гаварылася на канферэнцыі,—сведчанне расхлябанасці і той беспакаранасці, якая часам існуе ў адносінах да гультаёў і двоечнікаў. На адным са сходаў камсамольска-прафсаюзнага актыву ГДУ было прынята рашэнне аб тым, што камсамольскія бюро факультэтаў могуць хадайнічаць перад рэктаратам, дэканатамі аб адлічэнні студэнтаў, якія прапусцяць звыш 14 гадзін заняткаў без уважлівых прычын. Што ж атрымалася на справе? Колькасць вучэбных гадзін, прапушчаных студэнтамі ўсіх факультэтаў, намнога перавышае ўстаноўленую «норму», і заўзятыя прагульшчыкі, «хвасцісты» з універсітэта не выключаны. Як адзначалася ў справаздачным дакладзе, не выконваюць адведзеную ім ролю вучэбна-выхаваўчыя камісіі, якім не хапае ні баявітасці, ні прынцыповасці. Саветы ж выдатнікаў абмежаваліся толькі правядзеннем грамадскіх экзаменаў і далей не рухаюцца. Як упушчэнне называлася і тое, што пры вызначэнні лепшых акадэмічных груп універсітэта, не звяртаецца ўвага на самыя горшыя, не даецца належнай крытычнай ацэнцы такім адстаючым студэнцкім калектывам. Таму неабходна ўзмацніць увагу пярвічных камсамольскіх арганізацый на калектыўную адказнасць груп за якасць вучобы.

У выступленні дэлегата канферэнцыі ленінскай стыпендыяткі **Алены Цімашэнка** востра ставілася пытанне аб студэнцкім самакіраванні. Яму належыць вялікая будучыня, але не надаецца яшчэ належная ўвага на факультэтах універсітэта. Алена гаварыла аб формах студэнцкага самакіравання, аб тым, што ў гэтай справе патрэбна прынцыповая пазіцыя камітэта камсамола. Неабходна, каб гэта пазіцыя была не такой як у адносінах да ВВК, рабоце якой ён удзяляў мала увагі: адсутнічала сувязь паміж ВВК розных факультэтаў і магчымасць абменьвацца вопытам. Каштоўны ж вопыт у важнай справе ёсць у іншых ВНУ краіны. Таму ставіцца пытанне вывучэння яго, абагульнення і неадкладнага ўкаранення.

Загадчык кафедры палітэканоміі дацэнт **У. Ф. Бондараў**, які быў удзельнікам Усесаюзнай нарады загадчыкаў кафедр грамадскіх навук, у сваім выступленні засяродзіў увагу на неабходнасці зацвярджэння культа вучобы ў ВНУ, перанясенні цэнтра важкасці ў барацьбе за высокую паспяховасць у студэнцкія групы.

## ГАРТАВАЦЬ СЯБЕ Ў ПРАЦЫ

Існуе студэнцкая прымаўка: «Той не студэнт, хто не быў у будаўнічым атрадзе, не выпрабаваў сябе ў працы». Патрыятычны рух моладзі — справа вельмі карысная і неабходная. Працавітыя рукі студэнтаў у час летніх семестраў робяць вельмі шмат. Вялікія здабыткі ў гэтай справе ёсць і ў камсамольцаў універсітэта. Аб іх гаварыў у справаздачным дакладзе сакратар камітэта ЛКСМБ А. Дземідзенка. Але за поспехамі трэба заўсёды бачыць і недахопы, недапрацоўкі. На жаль, у справаздачным дакладзе аб іх не было сказана. А варта было б даць прынцыповую ацэнку такому факту як адмова некаторых камсамольцаў фізічнага факультэта паехаць працаваць на Хойніцкі кансервавы завод. Трэба было строга спытаць з групы, якая на сваім правяздачна-выбарным камсамольскім сходзе гэта пытанне нават не закранула. Студэнт эканамічнага факультэта **Юрый Тарасенка** сам неаднойчы ўдзельнічаў ў трэціх працоўных семестрах—быў і байцом, і камандзірам атрадаў, асабіста сутыкаўся з многімі цяжкасцямі, якія адмоўна ўплываюць на выніку работы. Таму ў яго выступленні на канферэнцыі больш гаварылася аб тым, што перашкаджае плённай дзейнасці СА. Нельга дапускаць фармалізму ў падрыхтоўчы перыяд: неабходна правільна падбіраць камандзіраў і камісараў атрадаў, тых, хто мае вопыт, вызначаецца актыўнасцю, валодае добрымі арганізатарскімі здольнасцямі. Трэба, зазначыў Юрый, аналізаваць работу адстаючых атрадаў, каб іншыя не паўтаралі іх памылак, улічваць заўвагі, выказаныя праверкамі ў рабочы перыяд. Усё гэта ў канчатковым выніку дазволіць у поўнай меры выкарыстоўваць вялікі патэнцыял студэнцкага працоўнага руху.

## НАВУКОВАЯ РАБОТА — ТВОРЧЫ ПРАЦЭС

XXVII з'ездам КПСС прадугледжана шырокае прыцягненне моладзі да вырашэння ключавых задач сацыяльнага і эканамічнага развіцця. Таму сённяшняга студэнта немагчыма ўявіць без актыўнага ўдзелу ў навукова-даследчай рабоце. У справаздачным дакладзе разам з асобнымі поспехамі ў гэтай справе называліся і недахопы. Сама сістэма навукова-даследчай работы студэнтаў далёкая ад дасканаласці. Так, ва універсітэце атрымаць веды самастойна студэнты могуць толькі ў чытальных залах. У ГДУ няма ніводнай лабараторыі або аўдыторыі, дзе б студэнт мог займацца самастойнымі даследаваннямі, вывучаў патэнтную літаратуру перадавога сусветнага вопыту, знаёміўся з навінкамі тэхнікі. Большая частка лабараторый у пазавучэбны час знаходзіцца на замку.

Аб нізкай эфектыўнасці навуковай работы ў ГДУ гаварыла ў сваім выступленні трэцякурсніца фізічнага факультэта, член камсамольскага бюро **А. Балакіна**. На факультэце, дзе яна вучыцца, многія студэнты займаюцца НДР у рамках гаспадарча-дагаворных тэм. Аднак гэта работа пакуль што застаецца недастаткова прэстыжнай сярод студэнтаў. Рэальную карысць НДР па гаспдагаворах прыносяць толькі адзінкі. Хутчэй фармальна, чым фактычна, дзейнічае студэнцкае канструктаркае бюро. Адсутнічаюць галоснасць аб НДР студэнтаў, абмен вопытам у гэтай справе паміж факультэтамі, іншымі ВНУ рэспублікі.

Далучаць студэнтаў да актыўнага навуковага пошуку, ад якога будзе рэальная аддача, — адна з важнейшых задач камсамольскай арганізацыі ГДУ.

## АКТЫЎНУЮ ПАЗІЦЫЮ — КОЖНАМУ

У апошні час мы часта чуем, вымаўляем словы «перабудова», «паскарэнне». А ці задумваўся хто-небудзь з камсамольцаў універсітэта, які канкрэтны ўклад можа ўнесці ён асабіста ў гэтыя перабудову і паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця? Нельга быць за перабудову форм камсамольскай работы толькі на словах, калі будзеш па-ранейшаму заставацца раўнадушным, пасіўным чалавекам, якому ні да чаго няма справы.

Натуральнае жаданне моладзі жыць цікава, насычана, каб студэнцкія гады заставаліся ў памяці назаўсёды. Але, як часта здараецца, яна не прыкладае для гэтага ніякіх намаганняў, чакае, што хто-небудзь прапануе ёй гатовае. Ад такіх спажывецкіх адносін трэба рашуча пазбаўляцца. Пра гэта гаварылі ў выступленнях на канферэнцыі прарэктар па завочнаму навучанню **Л. Н. Сечка**, першы сакратар Цэнтральнага РК ЛКСМБ г. Гомеля **І. Бордак**, старшыня турыстычнага клуба «Адысей», студэнтка 4-га курса гістфіла **Аксана Саладкова**, трэцякурсніца матэматычнага факультэта **Святлана Міхайлава**. Так, у акадэмічнай групе, дзе вучыцца Святлана, спачатку ўсе таксама чакалі, калі камітэты камсамола універсітэта, факультэта прапануюць ім цікавыя мерапрыемствы. Але хутка зразумелі, што на гэта спадзявацца не трэба, а рабіць усё самім. Сталі па-дзелавому, сур'ёзна адносіцца да вучобы, правядзення камсамольскіх сходаў у групе. І гэта дало добрыя вынікі: група заняла другое месца на матфаку. Праявілі фантазію і ў арганізацыі свайго вольнага часу. Сталі праводзіць пасяджэнні клуба «Што? Дзе? Калі?», конкурсы «Ану, хлопцы!», «Гумарыну» і інш.

Многія студэнты таго ж матэматычнага факультэта «знайшлі сябе» у літаратурным клубе «Градыент», які атрымаў ужо ўсесаюзнае прызнанне. Тут таксама ўсё будуецца на энтузіязме, ініцыятыве, творчасці саміх яго ўдзельнікаў. Каштоўны вопыт работы накоплены ў «Градыенце» і заслугоўвае ўвагі, належнай ацэнкі з боку камітэта камсамола універсітэта. Аднак, як справядліва зазначыла на канферэнцыі член клуба пяцікурсніца **Ларыса Сініла**, у справаздачным дакладзе камітэта ЛКСМБ ніводнага слова аб гэтым клубе не было сказана. Цяпер, калі ў краіне ствараюцца аматарскія аб'яднанні, клубы па інтарэсах і моладзь часта не ведае, з чаго пачынаць у іх работу, абагульненне, распаўсюджванне вопыту «Градыента» было б як раз дарэчы.

Цікава і насычана, як матэматыкі, жыць маглі б і многія іншыя студэнцкія групы універсітэта. Тады б у асобных камсамольцаў не заставалася часу на розныя негатыўныя ўчынкі, што ў канчатковым выніку вядзе да маральных страт.

## ШЭФСКАЙ РАБОЦЕ — ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

Перабудова вышэйшай і сярэдняй адукацыйнай школы патрабуе павышэння эфектыўнасці шэфскай работы камсамола. Універсітэтам наладжаны цесныя сувязі з сярэднімі школамі горада, прафтэхвучылішчамі. Студэнты праводзяць там гутаркі, дыспуты, іншыя разнастайныя мерапрыемствы. Аб гэтым гаварылася ў справаздачным дакладзе. Аднак час настойліва патрабуе іншых форм шэфства камсамола над школай. Спрабуюць іх знаходзіць педагагічныя атрады ГДУ, і, ў прыватнасці, біялагічнага факультэта, якім кіруе другакурсніца **Алена Маладзякова**. У сваім выступленні яна спынілася на цяжкасцях, з якімі даводзіцца сутыкацца. Мала ўвагі камітэтам камсамола універсітэта ўдзяляецца вучобе членаў педатрада. Наспела неабходнасць арганізаваць іх вучобу не толькі ў рамках факультэта, універсітэта, а нават і ўсяго раёна, каб была магчымасць даведацца, як працуюць іншыя педатрады, што цікавага ў іх праводзіцца, падзяліцца вопытам. Райкому камсамола, адзначыла А. Маладзякова, трэба звяртаць больш увагі на арганізацыю макаранкаўскіх атрадаў, куды залічваюцца цяжкія падлеткі, а камандзірамі і камісарамі з'яўляюцца студэнты. Пакуль што апошнія не заўсёды добра ведаюць, як ім трэба працаваць, а аднаго іх жадання перавыхоўваць цяжкіх падлеткаў мала.

Увага да шэфскай работы не павінна паслабляцца, таму што значэнне яе не толькі ў тым, што камсамольцы выхоўваюць падрастаючае пакаленне, але выхоўваюць і сябе як будучых педагогаў.

## ВЫХОЎВАЦЬ ПАТРЫЁТАЎ

Моладзь — будучыня планеты. А якой яна будзе, квітнеючай, блакітнай ці спаленай у пажары ядзернай вайны? За мірную будучыню павінны змагацца сёння юнакі і дзяўчаты, ніколі не забываць, што мір дастаўся нам вельмі дарагой цаной. Таму ваенна-патрыятычнае выхаванне было і застаецца важным напрамкам у рабоце камітэта камсамола універсітэта. На жаль, як гаварылася ў справаздачным дакладзе, у апошні час тут выявіліся некаторыя збоі. Раней добрай традыцыяй былі Зорныя паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Яны праводзіліся як агітацыйна-спартыўныя мерапрыемствы: студэнты ішлі на лыжах ад вёскі да вёскі, чыталі жыхарам лекцыі, выступалі з канцэртамі мастацкай самадзейнасці агітбрыгады. У апошні час Зорныя паходы ператварыліся ў паездку на аўтобусе калектыва клуба мастацкай самадзейнасці. Пачынае страчвацца глыбокі сэнс Зорнага агітпахода — ён становіцца проста серыяй канцэртаў.

Не можа не трывожыць і той факт, што прыйшла ў заняпад работа па стварэнню музея універсітэта. Тлумачаць гэта недахопам памяшканняў, аўдыторый. Іх стане дастаткова з уводам у строй новага вучэбнага корпуса. Але ж працаваць і выхоўваць моладзь неабходна зараз, каб рэальным, напоўненым сэнсам стаў выраз «Ніхто не забыты, нішто не забыта».

* * *

Справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя давала магчымасць павесці шчырую, адкрытую размову аб дасягнутых поспехах, наболелых пытаннях, якія хвалююць студэнцкую моладзь, нявырашаных праблемах. Час патрабуе рашучага пазбаўлення ад фармалізму, паказухі, неарганізаванасці ў рабоце камсамольскіх арганізацый, устанаўлення атмасферы праўдзівасці і самакрытычнасці. І ў большасці выступленняў дэлегатаў канферэнцыі адчувалася занепакоенасць тым, што яшчэ патрабуе паляпшэння, выпраўлення, імі ўносіліся канкрэтныя прапановы, як зрабіць больш эфектыўнай работу камсамольскай арганізацыі універсітэта.

Т. ДУБЯК.

## САСТАЎ КАМІТЭТА КАМСАМОЛА УНІВЕРСІТЭТА

**А. ДЗЕМІДЗЕНКА — сакратар камітэта ЛКСМБ.**
**А. БАРСУКОВА — намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце.**
**Ю. ТАРАСЕНКА — намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце.**
**З. КУР'ЯН—студэнтка 4-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**
**А. ДРОЗД — студэнт 4-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**
**Т. ЯРМОЛЬЧЫК — студэнтка 2-га курса эканамічнага факультэта.**
**С. ПАСПЕЛАЎ — студэнт 3-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**
**І. БРАТЧЭНЯ — студэнтка 4-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**
**Г. ЯНУЧОК — студэнтка 3-га курса фізічнага факультэта.**
**У. ТАЛКАЧОЎ—студэнт 2-га курса матэматычнага факультэта.**
**Л. ГАЎРЫЛЮК — студэнтка 2-га матэматычнага факультэта.**
**С. ЛЫСЕНКА — студэнт 3-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**
**В. ДРОЗД — студэнт 1-га курса эканамічнага факультэта.**
**С. АФАНАСЕНКА — студэнтка 2-га курса біялагічнага факультэта.**
**І. ЦЮНІНА — студэнтка 4-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**
**В. ЗЯЛЁНЫ — студэнт 3-га курса фізічнага факультэта.**
**С. АБРАМЕНКА — студэнтка 2-га курса біялагічнага факультэта.**
**Ю. СЕЛЯДЦОЎ — студэнт 3-га курса фізічнага факультэта.**
**І. КАТЛАБАЙ — студэнт 2-га курса геалагічнага факультэта.**

*Да 275-годдзя з дня нараджэння М. В. Ламаносава*

# «ПЕРШЫ НАШ УНІВЕРСІТЭТ»

Руская зямля дала чалавецтву нямала геніяльных і выдатных пісьменнікаў, пачынаючы ад невядомага аўтара «Слова аб палку Ігаравым». Асаблівае месца сярод іх займае М. В. Ламаносаў, 275-гадовы юбілей якога вось-вось адзначыць уся культурная грамадскасць нашай краіны.

М. В. Ламаносаў быў вучоным энцыклапедычнага размаху. Пушкін, гаворачы аб тым, што ён «все испытал и все проник», меў поўнае права назваць яго «першым нашым універсітэтам». Чалавек рознабаковых інтарэсаў і здольнасцей, Ламаносаў стаў першым рускім вучоным-прыродазнаўцам сусветнага значэння, адным з заснавальнікаў фізічнай хіміі. Ён распрацаваў тэхналогію атрымання каляровага шкла, сканструяваў люстэркавы тэлескоп, адкрыў існаванне ў Венеры атмасферы, вывучыў прыроду атмасфернай электрычнасці, паўночнага ззяння, даказаў арганічнае паходжанне глебы, торфу, каменнага вугалю, нафты, даследаваў льды і даў першую іх класіфікацыю. М. В. Ламаносаў падкрэсліваў палітычную і гаспадарчую важнасць для Расіі Паўночнага марскога шляху, прадбачыў, што «России могущество будет прирастать Сибирью».

Разам з навуковымі даследаваннямі Ламаносаў займаўся літаратурнай творчасцю і стаў паэтам, які заклаў асновы сучаснай рускай мовы. Ён дэталёва вывучаў рускую гісторыю і выступіў з крытыкай нарманскай тэорыі, якая адмаўляла самастойнае развіццё рускага народа, быў мастаком, аўтарам рада мазаічных партрэтаў і манументальнай «Палтаўскай баталіі», праяўляў клопаты аб распаўсюджванні ў краіне асветы, і па яго праекту ў 1755 годзе быў адкрыт Маскоўскі універсітэт— навучальная ўстанова еўрапейскага тыпу, куды змаглі паступаць выхадцы з розных слаёў насельніцтва.

Паэзія і навука не ўступалі ў Ламаносава ў супярэчнасць, а дапаўнялі адна адну: навука падказвала паэту новыя тэмы, паэзія развівала ўяўленне вучонага. Ламаносаў — вучоны і паэт, кінуўшы позірк з Зямлі на бяскрайні «зорны акіян», разгадваў таямніцы космасу: «Открылась бездна звезд полна, Звездам числа нет, бездне дна». Свае геніяльныя здагадкі аб прычынах атмасферных з'яў ён выкладае ў выдатным вершы «Вечернее размышление о божием величестве при случае великого северного сияния». У другім вершы, які ён назваў «Письмо о пользе стекла», — паэт сцвярджаў матэрыялістычны погляд на свет, праслаўляючы адкрыцці выдатных вучоных, магутнасць чалавечага розуму.

Сродкам асветніцкай прапаганды дасягненняў навуковай думкі і грамадска-патрыятычных ідэй стала пад пяром Ламаносава руская ода. Ён надаваў гэтаму традыцыйнаму ў сусветнай літаратуры жанру высокае грамадзянскае гучанне. Змест од вызначаўся палітычнымі поглядамі паэта, які стаяў на пазіцыях асветнага абсалютызму, заснаваных на абагульненні практычнай дзейнасці Пятра І. У одах, звернутых да імператрыц Елізаветы Пятроўны, а затым і да Екацярыны II, Ламаносаў распрацоўваў шырокія праграмы эканамічнага, прамысловага, палітычнага і культурнага развіцця краіны, заклікаў прытрымлівацца палітыкі і прыкладу Пятра Вялікага, які выступаў за росквіт Айчыны. Сын селяніна-памора Халмагорскага павета Архангельскай губерні, які пехатой прыйшоў у Маскву, працягваў адукацыю ў Пецярбургу і ў ліку лепшых вучняў затым быў камандзіраваны ў Германію, М. В. Ламаносаў сам стаў лепшым прыкладам вызначанага Пятром прынцыпа перавагі асабістай заслугі перад «пародай» — радавітасцю. Услаўляючы талент рускага народа, паэт горача даказваў, што пры наяўнасці шырокай асветы ў краіне можа «собственных Платонов и быстрых разумом Невтонов Российская земля рождать». А для гэтага адукаваны манарх павінен устанавіць мір і садзейнічаць развіццю навук і асветы. Ода ператваралася ў праграму развіцця рускай культуры, а наказ царам даваў былы селянін і рыбак, які дасягнуў вышынь вучонасці. У одах Ламаносава паўставаў вобраз паэта-грамадзяніна, выразніка ахапіўшага маладую нацыю патрыятычнага «захаплення».

Першая ода, напісаная Ламаносавым, ода «На ўзяцце Хоціна», была прыкладзена да «Пісьма аб правілах расійскага вершаскладання». З гэтага моманту, на думку Бялінскага, пачалася новая руская літаратура, а Ламаносаў «быў яе бацькам і пестуном»; ён «быў яе Пятром Вялікім». У «Пісьме» аўтарам была тэарэтычна абгрунтавана сілаба-танічная сістэма вершаскладання, якая ў асноўных рысах захавалася ў рускай паэзіі да нашых дзён. Ламаносаў канчаткова знішчыў усе перашкоды да свабоднага развіцця рускага верша. У яго паэтычнай творчасці змест упершыню знайшоў сабе адпаведнае мастацкае ўвасабленне. Паслухмяная волі аўтара кніжная руская паэзія змагла сказаць аб сабе: «Однако ныне вся уверена Россия, Что я красавица — российска поэзия».

Наватарства Ламаносава-паэта абапіралася на глыбокія традыцыі рускай культуры, рускай народнай творчасці, што адбілася не толькі ў смелым пераадоленні ранейшых уяўленняў аб вершаскладанні, але і ў рашэнні стаяўшай практычнай задачы ўпарадкавання норм складаючайся з пятроўскага часу літаратурнай мовы. Гэта ператварэнне з'явілася адным з галоўных подзвігаў у галіне мастацкай культуры. У рускай мове Ламаносаў убачыў «прыроднае багацце, прыгажосць і сілу...», якія не ўступалі ніводнай з еўрапейскіх моў. На аснове вывучэння жывой гутарковай мовы ён стварыў першае сапраўды навуковае апісанне рускай мовы — «Российскую грамматику». Самай сталай філалагічнай працай Ламаносава стаў трактат «Предисловие о пользе книг церковных в российском языке», дзе распрацоўваліся праблемы стылю, паэтычнага складу, выкладалася яго тэорыя «трех штилей», давалася класіфікацыя жанраў. У аснову працы леглі тры галоўныя думкі: па-першае, у рускай літаратурнай мове з царкоўнаславянізмаў павінны застацца толькі тыя, што жывуць у мове; па-другое, з кніжных крыніц павінна захавацца тое, што асвоена народам; па-трэцяе, першаасновай рускай літаратурнай мовы павінна быць пісьмовая і гутарковая мова народа. Моўная рэформа адкрывала шырокія магчымасці перад складваючайся літаратурай. Ламаносаў узаконіў выкарыстанне жывой рускай мовы, узбагаціўшы яе агульнаўжывальнымі славянізмамі, адкрыў крыніцу яе пастаяннага абнаўлення і выкарыстання прастамоўя ў творах нізкага «штылю».

Ламаносаў пісаў не толькі оды і навукова-філасофскія вершы, але і эпіграмы, ідыліі, пасланні, надпісы, сачыніў дзве трагедыі, перакладаў Анакрэона, быў аўтарам шырока распаўсюджанай ў спісах сатыры на рэакцыйнае духавенства «Гімн барадзе». Барацьбу з духавенствам Ламаносаў вёў на працягу ўсяго жыцця, выкрываў яго коснасць, невуцтва, адсталасць. Ламаносаву-паэту не была ўласціва павучальная дыдактыка. Выступаючы як мысліцель і патрыёт, ахоплены страснай любоўю да Айчыны, ён заражае сваім пафасам тых, да каго звернута яго палымянае слова.

Галоўны абавязак пісьменніка, на думку М. В. Ламаносава, — «радеть о благоденствии общества». Своеасаблівым паэтычным маніфестам стала напісаная ім «Размова з Анакрэонам», дзе ён сцвярджаў ідэал паэта-патрыёта, які ўслаўляе не асалоду і радасць чалавека ў каханні, дружбе, віне, а веліч і прыгажосць «возлюбленной матери» — Расіі.

Увабраўшы ў сябе вопыт чалавецтва, паэтычная творчасць Ламаносава стала глыбока нацыянальнай і самабытнай з'явай. Па-мастацку асэнсоўваючы і даследуючы тое, што складала «таямніцу» нацыі, жыццёвасць ламаносаўскай лініі пацвердзіла ўся наступная руская патрыятычная літаратура, а яго палымянае паэтычнае слова, звернутае да маладога пакалення, знайшло водгук і ў сэрцах нашчадкаў:

**Дерзайте ныне ободренны**
**Раченьем вашим показать,**
**Что может собственных Платонов**
**И быстрых разумом Невтонов**
**Российская земля рождать.**

**Л. ДЗЕМЯНЦЕЙ,**
**асістэнт кафедры рускай літаратуры.**

17 ЛІСТАПАДА — МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ СТУДЭНТАЎ

□

## У ДРУЖНАЙ СЯМ'І

Я прыехаў з Сацыялістычнай Дэмакратычнай Рэспублікі Шры-Ланка, каб вучыцца ў Савецкім Саюзе. Пасля заканчэння вучобы стану выкладчыкам, буду вучыць дзяцей на сваёй радзіме. Першы год вучобы на падрыхтоўчым факультэце прайшоў у Мінску— сталіцы БССР. Мне вельмі спадабалася ў Мінску. Гэта вельмі прыгожы горад, тут шмат памятных мясцін. Зараз мая вучоба працягваецца ў Гомелі, у ГДУ. Тут я набуду прафесійныя веды, неабходныя для маёй работы на радзіме. Вучыцца мне і маім сябрам не вельмі лёгка, кожны дзень сустракаецца нямала цяжкасцей. Але я не сумую, таму што тут многа добрых людзей — студэнтаў і выкладчыкаў, якія не шкадуюць для нас свайго часу, і я за гэта ім вельмі ўдзячны.

Са мной разам вучацца мае таварышы з іншых краін — Кампучыі, Маўрыкіі, Гвінеі, Беніна, Малаві. Тут таксама многа студэнтаў з іншых рэспублік СССР. Мы жывем дружнай сям'ёй, адным калектывам, заўсёды дапамагаем адзін аднаму. У вольны час мы ўдзельнічаем у розных цікавых мерапрыемствах — канцэртах, сустрэчах, экскурсіях. З гэтых сустрэч мы даведаліся многа цікавага аб жыцці і культуры савецкага народа.

Раней я нічога не ведаў аб Гомелі, але чуў, што гэта прыгожы зялёны горад, у якім ёсць цудоўны парк. Зараз я сам пераканаўся ў гэтым. Аб парку над Сожам я напісаў дадому сваім сябрам. Жыхары Гомеля вельмі гасцінныя і добразычлівыя. Я вельмі рады, што буду тут жыць і вучыцца на працягу пяці год.

Некаторыя замежныя студэнты, якія прыязджаюць на вучобу ў СССР, жадаюць вучыцца толькі ў буйных гарадах. Я таксама думаў гэтак. Але зараз мая думка змянілася: у Гомелі вучыцца нікольк не горш, чым у любым іншым горадзе. Тут спакойная, працоўная абстаноўка, добрыя ўмовы для заняткаў. А галоўнае — побач са мной мае савецкія і замежныя сябры.

**Дхамананда КАХАТАВІЛА,**
**(Шры-Ланка),**
**студэнт 1 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

## У ЛІТАРАТУРНЫМ КЛУБЕ «ГРАДЫЕНТ»

Яго актывістамі сталі многія студэнты матэматычнага факультэта, якія цікавяцца ўсімі жанрамі літаратуры. Аматары мастацкага слова рэгулярна праводзяць цікавыя мерапрыемствы. Нядаўна іх госцем быў загадчык кафедры беларускай літаратуры кандыдат філалагічных навук І. Ф. Штэйнер. Іван Фёдаравіч расказаў пра шляхі развіцця беларускай літаратуры, яе цяперашнія здабыткі, адказаў на шматлікія пытанні студэнтаў.

## *ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА—КРОК ДА САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ*





**Нядаўна кожны дзень званок клікаў пяцікурснікаў педагагічных спецыяльнасцей не ў студэнцкія аўдыторыі, а ў школьныя класы. Ішла педагагічная практыка. Яна стала крокам да самастойнай працы, выпрабаваннем на гатоўнасць даваць дзецям грунтоўныя веды. Таму і зразумела, што вельмі хваляваліся пяцікурснікі — «без пяці мінут настаўнікі». Але ім на дапамогу прыходзілі выкладчыкі універсітэта, якія кіравалі педагагічнай практыкай, настаўнікі-прадметнікі школ. Іх парада, падтрымка надавалі практыкантам упэўненасць у свае сілы.**

**На практыцы, якая праходзіла ў студэнтаў беларускага аддзялення гісторыка-філалагічнага факультэта ў СШ № 24 і 44 г. Гомеля, пяцікурснікі вучылі дзяцей любіць і шанаваць сваю родную беларускую мову. У шостым класе СШ № 44 яе ўрокі вяла студэнтка гр. БР-51 С. Старавыбарная (на здымку злева). Набывалі навыкі выкладчыцкай працы ў СШ № 24 дзяўчаты з гр. БР-52 В. Быхаўцава і Л. Грышкевіч. Наш фотакарэспандэнт застаў іх ў школе за падрыхтоўкай да ўрокаў.**

Фота Л. Акінчыц.

